*Л.Г. Дуктава*

# АДЛЮСТАВАННЕ ПРАБЛЕМ ЖЫЦЦЯ ПАЎЛА ВЯТРЭНКІ ПРАЗ ПРЫЗМУ ПРАБЛЕМ ЧАСУ Ў АПОВЕСЦІ "ЗОНА ПАВЫШАНАЙ РАДЫЯЦЫІ" І. ШАМЯКІНА

Аварыя на Чарнобыльскай станцыі адбылася ў 1986 годзе, пасля яе пятая частка нашай краіны была забруджана радыяцый, наступствы ўздзеяння якой трагічна адбіліся на лёсе людзей, стане прыроды, на ўсім тым, што знаходзілася на тэрыторыях, якія пазней былі пазначаны на карце Беларусі як "зона радыяцыйнага забруджавання". Але, напэўна, самым жудасным у гэтай трагічнай сітуацыі было тое, што людзі адразу пасля аварыі не атрымалі праўдзівай інфармацыі пра яе, не ведалі пра распаўсюджванне радыяцыі на нашых землях, не мелі магчымасці абараніць сваё здароўе, небяспекай для якога было знаходжанне на забруджаных тэрыторыях на працягу многіх дзён, месяцаў, нават гадоў. Толькі ў канцы васьмідзесятых – пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя інфармацыя пра чарнобыльскую аварыю і яе наступствы становіцца даступнай для шырокага кола грамадства. У гэты час у прэсе з'явілася шмат публікацый пра радыяцыйнае забруджванне беларускіх зямель. Да асэнсавання чарнобыльскай бяды актыўна падключыліся і айчынныя мастакі слова К. Жук, В. Зуёнак, А. Зэкаў, В. Казько, А. Кажадуб, В. Карамазаў, М. Мятліцкі, А. Пісьмянкоў, Б. Сачанка, Я. Сіпакоў, І. Пташнікаў, А. Федарэнка і інш.

Але адным з першых, хто адгукнуўся на гэту праблему быў І. Шамякін, які ў 1991 годзе выпусціў раман "Злая зорка", а праз пяць гадоў яшчэ і аповесць "Зона павышанай радыяцыі". Такая часавая адлегласць дала магчымасць творцу асэнсаваць постчарнобыльскую сітуацыю ў звязцы з іншымі падзеямі, з'явамі і працэсамі, якія адбываліся ў той час у грамадсве: палітыка перабудовы, вайна ў Афганістане, разбурэнне СССР і інш.

У аповесці "Зона павышанай радыяцыі" тагачасныя падзеі, зразумела, падаюцца вачыма іх сучаснікаў, выказванні і разважанні герояў сведчаць пра тое, што яны адчувалі, нават ведалі цану чарнобыльскай і афганскай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

памылак, прадбачылі сумную карціну разгортвання падзей у будучыні, але прадухіліць паследствы чужых памылак было цяжка, выкарыстоўваючы толькі ўласныя сілы. Так, герой аповесці Павел Вятрэнка як сучаснік аварыі на ЧАЭС спрабуе ацаніць сітуацыю і спрагназаваць наступствы паспешных і непрадуманых рашэнняў па прадухіленню радыяцыйнай катастрофы. Напрыклад, у частцы "Акадэмія радасці" ён разважае пра тое, што пасля Чарнобыльскай аварыі ўлады вырашылі перакінуць дывізіі, якія размяшчаліся на тэрыторыях радыяцыйнага забруджвання, з Беларусі ў Расію. Гэты герой твора прагназуе вынікі такога памылковага рашэння.

*"Праўда, некаторыя нацыянальныя мудрацы суцяшаюць сябе тым, што дывізія, па раздзелу, дасталася Расіі і хутка будзе выведзена. Наіўныя людзі! Думаюць, што, вывеўшы ўсе дывізіі, мы апынемся ў большай бяспецы. Ці не заплачам мы ад гэтага гадоў праз пяць – дзесяць?"* [1]

Жэня Вятрэнка, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане, разважае пра непатрэбнасць афганскай вайны:

*"Кажуць, у амерыканцаў з'явілася новая хвароба – "в'етнамскі сіндром". Будзе ён і ў нас – афганскі"* [432].

Трэба адзначыць, што ў гэты час перамены адбыліся і ў жыцці пісьменніка, пра што сведчыць Т. Шамякіна.

*"З адчуваннем катастрафічнасці свету, выкліканым і Чарнобылем, і стратай адзінага сына, і крушэннем ідэалаў, жыў Шамякін у апошнія свае трынаццаць гадоў. У 90-я гады ён піша ў асноўным аповесці, у пачатку XXI ст. – мемуарную прозу"* [2].

У "Зоне павышанай радыяцыі" пісьменнік сваю творчую задачу вызначае наступным чынам:

*"І вось што атрымалася: аповесць пра лёс афіцэра арміі, якую злачынна знішчылі. А можа, гэта не пра аднаго афіцэра, а пра ўвесь афіцэрскі корпус? Біяграфія ў кожнага індывідуальная. А трагедыя агульная – адна ва ўсіх"* [375].

Мае рацыю даследчык А. Бельскі ў яго наступным вывадзе:

*"У аповесці ён* [Шамякін. – *Л.Д.*] *працягвае асэнсоўваць сваю эпоху праз лёс канкрэтнага чалавека і сям'і"* [3].

"Зона павышанай радыяцыі" – гэта твор, у якім пісьменнік паказвае чалавека ў кантэксце такіх праблем як "чалавек і час", "чалавек і грамадства",

---

[1] *Шамякін, І.* Палеская мадонна: аповесці / І. Шамякін. – Мінск: Юнацтва, 1998. – С. 397. Далей пры цытаванні з гэтага выдання спасылка на яго будзе падавацца ў тэксце ў квадратных дужках з пазначэннем старонкі з яго.

[2] *Шамякіна, Т.* Сімволіка загалоўкаў у творах Івана Шамякіна / Т. Шамякіна // Маладосць. – 2006. – № 6. – С. 146.

[3] *Бельскі, А.* Чалавек – час – мараль ў прозе І. Шамякіна пра сучаснасць / А. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 3. – С. 24.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"чалавек і мараль", "чалавек і лёс", "чалавек і свабода". Вядучая тэма ў аповесці – тэма Чарнобыля, на якую, безумоўна, звярнулі ўвагу крытыкі і літаратуразнаўцы[4], але гэтая тэма вызначаецца тым, што ў шамякінаскай прозе мяжуе з тэмай Афганістана, пра што сведчыць раман "Злая зорка".

Задума стварэння аповесці "Зона павышанай радыяцыі" нарадзілася ў Шамякіна пасля наведвання родных мясцін на Гомельшчыне. Пра гэта сведчаць радкі з аповесці "Слаўся, Марыя!".

*"У 1996 годзе я пакланіўся магілам, убачыў жахлівыя сляды радыяцыі: знесены пасёлак, разбуралася вялікая ваенная база – амерыканцы рэзалі снарады, ракеты. Вынік падзеі – сюжэт сумнай аповесці з публіцыстычнай назвай "Зона павышанай радыяцыі"*[5].

У творы прысутнічаюць розныя нарацыйныя ўроўні: першы – калі наратарам з'яўляецца пісьменнік Іван Шамякін (часткі "Пралог" і "Працяг пралога"); другі – наратар у асобе палкоўніка Паўла Паўлавіча Вятрэнкі (часткі "На краі свету", "Акадэмія радасці", "Ля белага мора", "Вяртанне", "Агульная бяда", "Адзіноцтва").

Што датычыцца першага ўроўню, то тут трэба адзначыць, што для шамякінскай прозы канца XX – пачатку XXI стагоддзяў даволі характэрным з'яўляецца той факт, што наратарам выступае пісьменнік Шамякін, які прысутнічае ў творы як рэальная асоба ва ўзросце, адпаведным часу напісання пэўнага твора (праз два гады пасля "Зоны павышынай радыяцыі" выйшла аповесць "Слаўся, Марыя!", дзе наратар – таксама пісьменнік Іван Шамякін, які сумуе па сваёй жонцы, што памерла ў 1998 годзе).

У аповесці "Зона павышанай радыяцыі" чытаем:

*"Ах, каб да мяне сённяшняга, сівога і ўмелага сачыніцеля, вярнуўся той юнацкі палёт думак! Здаецца, летуценні і творчы вопыт – уменне занатаваць фантазіі, па-мастацку арганізаваць іх – далі б цудоўны сплаў. Ці толькі так здаецца? Мабыць, трэба яшчэ адно, самае істотнае, – вера ў дзівосы. А веру тую, якая была ў 12–15 гадоў, у 75 вярнуць немагчыма. Якія дзівосы, калі вакол вельмі суровая рэчаіснасць!"* [360]

Акрамя таго, пра прататыпнасць вобраза наратара сведчаць аўтабіяграфічныя элементы аповесці. Часам нават можна правесці паралелі з дзённікавымі запісамі І. Шамякіна. Яркім прыкладам такіх супадзенняў з'яўляюцца факты з біяграфіі пісьменніка, якія звязаны з расповедам пра яго продкаў. У аповесці "Зона павышанай радыяцыі" чытаем:

---

[4] Тэматычны план аповесці "Зона павышанай радыяцыі" разгледжаны ў публікацыі М. Прохар "Эсхаталагічныя матывы ў творах Івана Шамякіна, прысвечаных чарнобыльскай трагедыі" (Роднае слова, 2010, № 2) і інш.

[5] *Шамякін, І.* Пошукі прытулку: аповесці / І. Шамякін. – Мінск: Юнацтва, 2001. – С. 90.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Леснічоўку немцы спалілі. Новую лясніцтва не магло хутка збудаваць. Пасля вызвалення бацька збудаваў хату бліжэй да людскога жытла – побач з рускім пасёлкам. Праз многа гадоў геадэзісты-картографы дакладна вызначылі лясную мяжу паміж рэспублікамі і раптам з прэтэнзіяй да бацькі: "Дзед! Што ж ты хлеў паставіў на рускай зямлі? Хата – на беларускай, хлеў – на рускай!"*

*Маці баялася, што прымусяць хлеў знесці. Ніхто з улад слова не сказаў. Толькі кпілі і беларусы, і рускія, што ляснік Шамяка жыве ў дзвюх рэспубліках адначасова"* [363].

Правядзём паралелі з запісамі пісьменніка ў дзённіку "Роздум на апошнім перагоне".

*"Пры адступленні немцы спалілі леснічоўку, не мінулі і адзінокай хаты.*

*У 1994 годзе бацька пачаў будаваць уласную хату: трэба жыць, а спадзявацца, калі пабудуе лясніцтва, – доўгая песня.*

*Хату ён паставіў хітра: на краі пасёлка Чэхаў, "упісаўшыся" ў вуліцу. Але... пасёлак рускі, Навазыбкаўскага раёна, а бацькава хата – на беларускай зямлі, у Добрушскім лясніцтве. Пасля ён расказваў са смехам: удакладнялі картографы мяжу, візіравалі прыборамі і – да бацькі з прэтэнзіяй: "Дзед, ты што гэта нарабіў? Ты знаеш, палавіна твайго хлява ў Беларусі, а другая палавіна – у Расіі?" Маці баялася, што прымусяць разбурыць хлеў"*[6].

Шамякін уключае такія аўтабіяграфічныя фрагменты ў канву твора, падкрэсліваючы еднасць аўтара і галоўнага героя. Такі прыём дазваляе дадаткова падкрэсліць тое, што чарнобыльская бяда ўспрымаецца пісьменнікам як уласная бяда. Чарнобыль пакінуў у яго на душы незагойную рану, бо малая радзіма творцы пераўтварылася пасля аварыі на ЧАЭС у зону радыяцыйнага забруджвання.

*"Прыйшла вялікая бяда на землі братніх рэспублік – чарнобыльская. Не адразу – праз год ці нават два – я даведаўся, што ваенны гарадок і пасёлак накрыла радыяцыяй. <...> Наступае ўзрост, калі чалавека цягне пакланіцца магілам бацькоў, наведаць мясціны свайго маленства, юнацтва, маладосці. Пацягнула і мяне. <...> Дэпутат Вярхоўнага Савета Саюза ад няшчасных раёнаў – Брагінскага, Хойніцкага, Лоеўскага, Рэчыцкага, я наведваўся ў зону і ў часе адсялення вёсак, ферм і пасля гады тры, калі пустыя селішчы людскія ўяўлялі жахлівы выгляд"* [365].

Асноўную ўвагу аўтар скіроўвае на гісторыю жыцця Паўла Паўлавіча Вятрэнкі, якога наратар-пісьменнік сустрэў падчас свайго візіту на малой радзіме.

*"Перада мной стаяў невысокага росту хударлявы чалавек, лысы ўжо, у цывільнай сарочцы, але ў накінутым на плечы фрэнчы з пагонамі палкоўніка –*

---

[6] *Шамякін, І.* Роздум на апошнім перагоне: дзённікі 1980–1995 гадоў / І. Шамякін. – Мінск: Маст. літ., 1998. – С. 37.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*у такую спякоту. <...> Безумоўна, яму было за пяцьдзесят, хоць зморшчыны яшчэ не збаразнілі яго твар. Для яго ўзросту мог бы здацца маладжавым, каб не адна адмеціна: правую скроню і шчаку не... не абпаліў, а як бы ўеўся ў яе порах – тры астраўкі сіняга россыпу; блізкасць ад вока адной такой парахавой плямы надавала самаму воку зусім іншы колер, іншы бляск і як бы касавокасць, хоць у сапраўднасці яе не было"* [368–369].

Зразумела, гэтая нечаканая сустрэча з чалавекам, які вырашыў жыць на тэрыторыі *"зоны павышанай радыяцыі"* ўражвае, зацікаўлівае. Што падштурхнула адстаўнога палкоўніка застацца тут? Пытанне, на якое не можа быць адназначнага адказу. Менавіта таму праз некаторы час Вятрэнка дасылае пісьменніку-наратару сваю "споведзь". Яго ўспаміны складаюць другі нарацыйны ўзровень аповесці.

У творы ідзе гутарка пра жыццё афіцэра Вятрэнкі. Яго сям'я жыве на самым паўднёвым востраве Курыл у гарнізоне. Павел Паўлавіч Вятрэнка – ваентэхнік па ахове зброі. Разам з жонкай Галяй вырасцілі адзінага сына Жэню, які вырашыў пайсці па слядах бацькі – стаць ваенным. Хлопец паступае ў Мінскае сувораўскае вучылішча. Каб быць бліжэй да сына, Павел Вятрэнка вырашае таксама пайсці вучыцца ў ваенную акадэмію ў Маскве, паступае туды з другога разу.

"Маскоўскі" перыяд жыцця сям'і Вятрэнкаў – бадай самы шчаслівы за ўсё жыццё: муж і жонка з'яўляюцца студэнтамі сталічных ВНУ, часта наведваюць сына, маюць насычаны культурны адпачынак. Пасля жыццё раскідала сям'ю *"ў розныя канцы вялікай Радзімы"* [399]: сына адправілі служыць у Грузію, бацьку – у Кандалакшу, адкуль, атрымаўшы званне падпалкоўніка, праз чатыры гады ён перавёўся ў Беларусь, на поўдзень Гомельшчыны. Менавіта тут збылася іх даўняя мара – уласнае жыллё. У бацькоўскай хаце адбылося і вяселле іх сына Жэні, які прыехаў на пабыўку да бацькоў. Разам з маладой жонкай Людай малодшы Вятрэнка вярнуўся ў Ташкент, дзе служыў напярэдадні візіту ў Беларусь.

Здаецца, жыццё сям'і Вятрэнкаў наладжвалася. Але кароткае пісьмо ад нявесткі стала бацькам прадвесцем бяды.

*"Жэню пагналі ў Афганістан"* [422].

Бацькоўскія пачуцці напоўнены трывогай за сына, таму ў хуткім часе падпалкоўнік Вятрэнка адпраўляецца ўслед за сынам – падае прашэнне аб накіраванні яго служыць у Афганістан. Падчас сустрэчы з Жэнем перад бацькам ў асобе сына паўстае баявы капітан Вятрэнка, дарослы мужчына, які смела разважае пра бессэнсоўнасць афганскай вайны. Затым менавіта тут, на далёкай гарачай зямлі, бацькоўскае сэрца абпаліла вялікае гора: адзіны сын загінуў. Сумам і болем напоўніліся астатнія дні пасля трагедыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Не магу апісаць страшнае падарожжа побач з целам сына ў цынкавай труне, бо ўсё неяк змяшалася ў галаве і, здаецца, застаўся адзін гул самалёта. Не помню нават – у Ташкенце ці ў Маскве, – я пагразіў аднаму чыноўніку пісталетам, і мной займалася ваенная камендатура, але, высветліўшы, што я вязу і за што – за абразлівую перагрузку труны – я ўскіпеў, адсталі, нават папрасілі прабачэння"* [438].

Пахавалі сына на лясных могілках, што з'явіліся пры пасёлку, дзе была хата Вятрэнкаў. Дагляд магілы стаў абавязковым клопатам маці, якая і ўзімку, і ўлетку прыносіла сюды жывыя кветкі. Але гэтую сям'ю напаткала новая бяда, нечаканая і вялікая, якая закранула лёсы многіх людзей, – аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі, якая знаходзілася ў сумежным раёне. Навіну пра тое, што адбылося ў Чарнобыле, Вятрэнка, ужо ў званні палкоўніка, дазнаецца з тэлевізара. Разумеючы жахлівасць аварыі, ён адным з першых пачынае біць трывогу, бо пацверджаннем яго небессэнсоўных трывог пра радыяцыйную небяспеку сведчаць нават яго прыборы па вымярэнні радыяцыі. Вятрэнка праяўляе ініцыятыву, каб на верталёце абляцець станцыю і паглядзець абстаноўку разам з прадстаўнікамі ўлады.

*"Тут жа ашаламіла мяне яшчэ адно: цывільныя, абласнога, раённага рангу, ахвотна згадзіліся ляцець, з міністраў ніхто не паляцеў"* [445].

Упэўнены ў сваёй праваце па высяленню людзей з пасёлка палкоўнік прымае актыўныя дзеянні.

*"Я напісаў адразу на некалькі адрасоў – у ЦК, штаб акругі, у Міністэрства. І... атрымаў: праз месяц Малчан не без зларадасці прачытаў мне загад аб маёй адстаўцы ў сувязі з уростам, хоць да "палкоўніцкай мяжы" заставалася яшчэ больш як год"* [449].

Эвакуацыя пачынаецца праз тры гады, але муж і жонка Вятрэнкі засталіся жыць у "зоне". Гэта месца стала іх апошнім прыстанішчам, бо тут знаходзілася магіла іх адзінага сына. Апошнія радкі ўспамінаў палкоўніка гучаць жыццясцвярджальна: *"Трэба жыць!"* [466].

Адну з трапных ацэнак выбару, перад якім знаходзяцца шамякінскія героі, дае А. Бельскі.

*"Усвядомлены, па сваёй сутнасці экзістанцыяльны, выбар ужо немаладых людзей, якія асудзілі самі сябе на пакуты і смерць у зоне, раскрывае не толькі асабістую трагедыю шамякінскіх герояў, але і агульнанародную бяду. Можа падацца, што яны страцілі інстынкт самазахавання і адчуванне суровай чарнобыльскай рэальнасці. Аднак, як думаецца, іх найперш абпаліла радыяцыя, што прысутнічала "ва ўсім жыцці", бо сацыяльна-маральны Чарнобыль быў не менш небяспечны для людзей, якія доўга жылі ў няўпэўненасці, напружанні і ператварыліся ў вечных вандраўнікоў"*[7].

---

[7] *Бельскі, А.* Чалавек – час – мараль ў прозе І. Шамякіна пра сучаснасць / А. Бельскі // Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 3. – С. 25.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як было адзначана вышэй, другі нарацыйны ўзровень аповесці "Зона павышанай радыяцыі" складае споведзь палкоўніка Вятрэнкі; герой вядзе размову ад ўласнага "я", і зразумела, што гэта не проста ўспаміны пра ўласнае жыццё, а яго споведзь. Жыццёвая лінія Паўла Паўлавіча Вятрэнкі, як вызначыў ён сам, была "эліпсоідная".

"Але дзе ў ёй фокусы! І ці аднолькавая адлегласць да фокуса ад гіпербал і парабал жыцця?" [370], – філасофствуе ён.

Лёс гэтага чалавека прыпаў на час трансфармацыі грамадскага светапогляду; разбурэнне мінулых ідэалаў адбываецца і ва ўласным жыцці героя. У сталым узросце Вятрэнка расчараваўся ў сваёй справе. Памяняліся адносіны да людзей у афіцэрскіх мундзірах, якія раней звычайна лічыліся ўзорамі чалавечай годнасці і гонару. Так званая "эпоха перамен" як лакмусавая паперка прадэманстравала прагніўшы стрыжань ваеннай вярхушкі.

*"А між тым, як разумею цяпер, "працэс пайшоў" яшчэ з лёгкай рукі Генсека, які меў асабістых машын ажно сорак чатыры штукі і столькі ж ордэнаў. За ім кінуліся медуновы, рашыдавы, іцковы, пазней далучыліся сакратары гаркомаў, генералы і палкоўнікі. Асабліва ў групах войск – за мяжой, дзе большая прастора для самай хітрай камерцыі і дзе было чым адкупіцца ад інспектараў Мінабароны: грузілі "мерседэс" у закрыты фургон... Аднаму, хадзілі чуткі, нават разабраную дачу ў вагоны пагрузілі. А сабраць яе – сіла бясплатная – салдаты"* [412–413].

Для таго, каб найбольш ярка паказаць гніласць сістэмы ўлады грамадзянскай і ваеннай, аўтар уключае ў твор адмоўныя вобразы чыноўнікаў, афіцэраў. Менавіта апошніх нямала сустрэў на сваім жыццёвым шляху Павел Паўлавіч. Гэта Корсун, Краснеўскі, Сімакоў, Молчан і інш. За знешняй дабразычлівасцю і любоўю да парадку ў іх хавалася толькі ўласная карысць, фармалісцкія адносіны да ваеннай справы.

Адзін з каларытных прадстаўнікоў двурушнай ваеннай улады – начальнік базы ў Кандалакшы Антон Пятровіч Корсун. Накіраваны на гэта месца працы пасля акадэміі Вятрэнка не мог стрымаць сваёй незадаволенасці абыходжаннем на гэтай ваеннай базе са зброяй.

*"База – вялізны склад: гара зброі – ад рэвальвераў да гармат, тысячы тон боепрыпасаў. Усё гэта недагледжана так, як патрабуе інжынерная навука. Няхай гармата з паржавелым затворам сама не выстраліць, а снарады і ракеты "зямля-зямля", "зямля-паветра", з'едзеныя ржой, могуць, крый Божа, і самаўзарвацца. Якая можа быць бяда! Страшна падумаць. <...> Зрабіўшы пільную інспекцыю, я даклаў Корсуну вусна"* [400–401].

На першы погляд, наступныя дзеянні начальніка базы з'яўляліся закамернымі, справядлівымі: загадам абвясціў вымову начальнікам складоў і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

інжынерам, абавязаў іх ліквідаваць недахопы ў два тыдні. Але гэта была толькі знешняя рэакцыя на актыўнасць сумленнага Вятрэнкі. Для таго каб пазбавіцца ад яго, Корсун напісаў *"ва Упраўленне Міністэрства, што ім прыслалі з акадэміі псіхічна хворага чалавека, алкаголіка"* [402].

Вынік дзейнасці прыехаўшай камісіі – вызваленне начальства базы ад пасад. Здаецца, тут можна гаварыць пра своечасовае выкрыццё хціывых дзеянняў прадстаўнікоў ваеннай прафесіі, сцвярджэнне вечнай ісціны "дабро перамагае зло". Але час паказаў адноснасць жыццёвага пакарання былога начальства базы.

*"Перагнулі палку, перайгралі самых сябе, загубіў алкаголь не мяне, цвярэзніка, а іх, добрых выпівах. Хоць якога чорта загубіў! Корсун не ведаю, дзе апынуўся, а Краснеўскі ў Заходняй групе войск даслужыўся да генерала. І, пісалі мне аднакашнікі, збудаваў пад Масквой палац, а, пайшоўшы ў адстаўку, узначаліў нейкую фірму, стаў капіталістам. Наш палітычны выхавацель!"* [402]

Даволі трапна пададзена характарыстыка яшчэ аднаго начальніка базы падпалкоўніка Сімакова: *"дзіўная мешаніна інтэлігентнасці з ваеннай амбіцыёзнасцю, жаданнем даказаць: я добры, але не забывайце, што камандую вамі я, я слухаю вас, але свой розум маю"* [406].

Але самым каларытным прадстаўніком ваеннай бюракратыі з'яўляецца Молчан. Падзеі на чарнобыльскай АЭС як у фокусе паказалі дамінаванне карыслівых інтарэсаў начальніка базы на Гомельшчыне, нежаданне адказваць за лёсы іншых людзей. Ён фактычна не жадае самастойна рэагаваць на дзеянні Вятрэнкі па прадухіленні наступстваў аварыі, да апошняга клапоціцца толькі пра ўласныя інтарэсы. Знешне спакойны перад падначаленымі адносна радыяцыйнага забруджвання на тэрыторыі базы, сам у Гомелі атрымаў трохпакаёўку, куды перавёз сям'ю, ды *"штодня ездзіў начаваць туды, за сорак кіламетраў"* [448]. Акрамя таго, Молчан да апошняга не жадае прымаць ніякіх дзеянняў адносна адсялення людзей, нягледзячы на актыўную працу на гэтай ніве падначаленага Вятрэнкі.

У творы праводзіцца думка, што, з аднаго боку, вяршынь ваеннай кар'еры дабіваюцца, у асноўным, толькі двурушныя людзі. Пад прыкрыццём афіцэрскага мундзіра, дэманстрацыі любові да парадку, самаадданасці і саахвярнасці ў ваеннай працы могуць хавацца тыя, для каго першаснае значэнне маюць уласны камфорт і дабрабыт. З другога боку, сама тагачаная грамадская думка фарміруе свайго роду імідж, і такія патрабаванні да ваеннага начальства:

*"У людзей логіка дзіўная: яны не любяць тых начальнікаў, хто хапае звыш таго, што ім належыць, але яны трацяць павагу і да таго, хто не выкарыстоўвае сваіх прывілей, – маўляў, іграе ў праведніка, бессярэбраніка"* [406].

Адносна супрацьлегласцей грамадскага жыцця Вятрэнка разважае наступным чынам.

*"З'явілася адчуванне, што ўся вялікая краіна жыве ў зоне павышанай радыяцыі. Палітычнай. Маральнай. Матэрыяльнай. Ішла гарбачоўская перабудова. Тэлебачанне, газеты аплёўвалі тое, што людзі будавалі сем дзесяткаў гадоў і што ім было дарагім. Здзіўляла мяне, адкуль узялося столькі плевакоў. Я сам настроены быў даволі крытычна супраць ваеннай і грамадскай бюракратыі, бяздушнасці, абыякавасці чыноўнікаў.* <...> *Вучылішча, служба, акадэмія, высокая адказнасць за справу, інжынерная дакладнасць зрабілі з мяне безадказны механізм. Але корсуны і молчаны сыпалі ў яго пясок, і ён не толькі буксаваў – ён загараўся. Мяне абураў непарадак у арміі"* [449–450].

Галоўны герой аповесці палкоўнік Павел Паўлавіч Вятрэнка асуджае працэсы, якія адбываліся ў тыя часы ў войску і ў грамадскім жыцці. Ён сам, яго сын і падобныя на іх афіцэры не могуць зміры́цца з тагачаснымі меркаваннямі наконт твару прадстаўніка ваеннай прафесіі. Напэўна, такія, як бацька і сын Вятрэнкі, выратоўвалі добрае імя афіцэра ў гэтую неспакойную гадзіну.

Калі надышла пара выбару жыццёвага шляху, Жэня Вятрэнка адназначна вырашыў паступаць у ваеннае вучылішча. Хоць і *"бачыў цяжкую і аднастайную службу бацькаву, бачыў, як маладыя лейтэнанты штодня нудна маршыравалі на пляцы разам з салдатамі – і ўсё роўна, нішто яго не расчароўвала, не разбурала вайсковай рамантыкі"* [382].

Такое рашэнне імпанавала бацьку.

*"І мне гэта вельмі падабалася, я сам пачаў глядзець на сваю "мазутную справу" як бы вачамі свайго сына"* [382].

Але, напэўна, самае каштоўнае, што Яўгеній Вятрэнка гэтую самаадданасць вайсковае справе пранёс праз усё жыццё, загінуўшы падчас бою на афганскай зямлі.

Старэйшы Вятрэнка сваю годнасць афіцэра найбольш праявіў падчас чарнобыльскай трагедыі. Магчыма, у гэтай надзвычайнай сітуацыі ён найбольш адчуў свае прызначэнне як вайскоўца-прафесіянала.

*"Афганістан, смерць сына, Чарнобыль узбунтавалі мяне і, як кажуць, завялі на крутыя абароты"* [450].

На працягу твора гэты герой паслядоўна сутыкаецца з неабходнасцю пераадольваць лёс. Але спробы супрацьстаяць сваёй долі былі асуджаны на правал. Павел Вятрэнка добра вучыўся ў сталічнай акадэміі, каб паступіць у аспірантуру, але *"дарогу* [яму. – *Л.Д.*] *перайшоў сынок аднаго туза"* [402]. Ён сумленна працаваў на часовай пасадзе начальніка ваеннай базы, але начальства прызначала на яе іншага, Вятрэнку ж *"падсаладзілі пілюлю – прысвоілі чарговае званне"* [404]. Ён маючы на мэце зберагчы адзінага сына, баявога капітана, добраахвотна адправіўся служыць у Афганістан, але ў хуткім часе няўмольны лёс вярнуў яго на радзіму як суправаджальніка труны з



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

целам свайго дзіцяці. Тым не менш, ніякія перашкоды не згубілі ў ім чалавечай годнасці. Перад намі не зламаны лёсам чалавек, а моцная асоба, здольная не толькі разумець чужы боль і спачуваць, але і прымаць рашэнні і дабівацца іх выканання. У творы паказана, што дзякуючы намаганням Вятрэнкі людзей пачалі адсяляць з забруджанай тэрыторыі. М. Прохар у сувязі з гэтым адзначае, што *"галоўная думка Івана Шамякіна ўсё ж, відаць, у тым, што чалавек здольны пераадольваць пакуты, яго нельга запалохаць, ён мае права на ўласны выбар"*[8].

Абыякавасць і безадказнасць пануюць, як заўважае герой, практычна на ўсіх этапах ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі. Яго, спецыяліста па радыяцыйнай бяспецы, уражваюць як непрадуманныя дзеянні выратавальнікаў адразу пасля аварыі (*"Мы тройчы абляцелі станцыю. Бачылі, як падляцелі адзін за адным тры верталёты і скінулі ў жарало мяшкі з пяском. Мы ўжо ведалі, што рэактар спрабуюць затушыць пяском, бетонам, свінцом. Сумнення гэта не выклікала: спецыялісты ведаюць, што робяць. Але да мяне нахінуўся Васіль Барысавіч, акадэмік, і закрычаў, што, на яго думку, такі спосаб мала што дасць, а мільёны лішніх рэнтгенаў выплюхне ў атмасферу"* [446]), так і безадказныя ўчынкі, якія дапускаюць людзі падчас эвакуацыі (*"Але эвакуацыя не адбылася так, як у першыя дні аварыі, калі людзей адсялялі за дзень-два. Адсяленне цягнулася месяцы тры, асеннія. І што рабілася! Які ажыятаж! Практычныя рабочыя – сяляне перш-наперш – збывалі жывёлу, якая набрала тут... несмяротную, але ўсё ж немалую дозу радыяцыі. Кароў, цялят, свіней вывозілі на грузавіках базы (Молчан шчодра даваў іх) у Расію – у Клінцы, Старадуб, Бранск; там не было такога кантролю, як у блізкім Гомелі. За ніжэйшую цану ішло ўсё; перабудова даводзіла да голаду"* [453]).

Здаецца, падчас чарнобыльскай катастрофы прадстаўнікі ваеннай прафесіі павінны былі ажыццявіць асноўную задачу – абараніць ад радыяцыйнай атруты мірнае насельніцтва. Але аказалася, што такіх людзей было няшмат. У такой крытычнай сітуацыі рысы характару кожнага чалавека быццам агаліліся – праявілася сутнасць тых, хто меў дачыненне да гэтай бяды. Антыподамі паводле іх стаўлення да чарнобыльскай праблемы з'яўляюцца Молчан і Вятрэнка. У вобразе першага паказаны такія рысы як двурушнасць, карыслівасць, абыякавасць да лёсу іншага чалавека. У вобразе другога – адданасць прафесійнаму абавязку, рашучасць, спачувальнасць, нават самаахвярнасць. Павел Вятрэнка не можа змірыцца з раўнадушнасцю ўлады да лёсу людзей.

М. Прохар у сувязі з гэтым адзначае наступнае:

---

[8] *Прохар, М.* "Эсхаталагічныя матывы ў творах Івана Шамякіна, прысвечаных чарнобыльскай трагедыі / М. Прохар // Роднае слова. – 2010. – № 2. – С. 29.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Чарнобыль як эсхаталагічны сімвал бяды трансфармуецца ў свядомасці героя ў Чарнобыль духоўны"*[9].

Аўтар у аповесці і ўсхваляе героя, і спачувае яму ў спробах выжыць у няўтульным, непрыдатным для чалавечага шчасця свеце. Пэўны душэўны спакой і раўнавагу Вятрэнка знаходзіць, застаўшыся жыць у "зоне павышанага забруджвання".

*"Мы тыя, хто лагічна працягвае сваё жыццё пад тым жа напружаннем, пад якім яно было бадай увесь час, у той жа "зоне". Я напісаў у "мёртвай зоне" і выкрасліў слова мёртвай. Не, яна не мёртвая, гэтая зона. Але яна – зона. <...> Я служыў у зоне. А ў зоне ўсе роўныя. Цяпер толькі я разумею, як мала значылі мае зоркі. З'явілася б на маіх пагонах маршальская зорка – і яна нічога не значыла б. Жыў бы я ў Маскве, а не ў лесе. Ну і што? Хіба Масква не лес? Ды не, лес павінен абразіцца, што я параўноўваю яго з гіганцкім сметнікам! Я ў зоне, але я вольны. Гэта незвычайная, небывалая за ўсю гісторыю чалавецтва з'ява: быць ў зоне і жыць вольным"* [396].

У творы неаднаразова аўтар спрабуе асэнсавасць шматграннасць паняцця "зона". Гэта не проста абмежаваная тэрыторыя, пазначаная шыльдай, якая сігналізуе пра небяспеку. Гэтая частка беларускай зямлі паказана ў творы ў гістарычнай рэтраспекцыі: да аварыі, падчас яе і ў першыя месяцы пасля трагедыі, а таксама праз некалькі гадоў пасля чарнобыльскай падзеі. Пры апісанні зоны аўтар выкарыстоўвае прыём кантрасту.

*"Яблыні свяціліся пераспелымі ранетамі, антонаўкамі, штрыфелямі, малінаўкамі... Кожны гаспадар стараўся здзівіць суседзяў рэдкімі гатункамі. Цяпер плады нікому не патрэбныя. Бярвенні вывезлі, на яблыні ніхто не спакушаўся"* [366].

Заслугоўвае ўвагі частка аповесці, дзе гутарка ідзе пра ваўкоў у "зоне".

*"І тады яны завылі, ваўкі, двое, пад самым акном. Дуэтам. Мабыць, воўк і ваўчыца, бо выла адзін басам, другая фальцэтам. Мяне працяў холад. Чуў я воўчае выццё. У маленстве. У тайзе. Але тут яно здалося асабліва страшнае. Не думаю, што галодныя. Не маглі яны ў нашым лесе быць галоднымі: дзікі, ласі ходзяць, небяспекі не адчуваюць. Дык што ж ім трэба каля адзінокай жылой хаты? Вырашылі напалохаць і выжыць нас? Хто адключэннем святла, хто выццём. І людзі і звяры на нас?"* [461–462].

Дарэчы, сцэны прысутнасці гэтага прадстаўніка дзікай фауны каля чалавечага жытла нярэдка сустракаюцца ў творах беларускіх пісьменнікаў на чарнобыльскую тэму. Але пры гэтым дадзены анімалістычны вобраз мае розную сэнсавую нагрузку. З аднаго боку, як паказана ў аповесці "Зона павышанай радыяцыі", вобраз ваўка сімвалізуе моц, сілу – гэта жывёла адчувае сябе гаспадаром "зоны", гаспадаром над чалавекам, бо не баіцца яго.

---

[9] *Прохар, М.* "Эсхаталагічныя матывы ў творах Івана Шамякіна, прысвечаных чарнобыльскай трагедыі / М. Прохар // Роднае слова. – 2010. – № 2. – С. 29.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З другога боку, як можна назіраць у паэме "Чорная быль" С. Законнікава, дзе воўк гіне пад коламі КрАЗа, гэты звер выклікае спачуванне. Але ў абодвух выпадках задача мастакоў слова аднолькавая: паказаць трагедыю чарнобыльскай бяды, адлюстоўваць, як адбываецца дэградацыя знешняга асяроддзя.

Што можа ўратаваць чалавека ў час трагедыі? Як і ў папярэднім творы на чарнобыльскую тэму, рамане "Злая зорка", пісьменнік звяртаецца да рэлігійнага пытання, гутарка ідзе пра ідэю выратавання праз веру[10]. На працягу аповесці чытач назірае, як набліжаецца да разумення прысутнасці ў нашым жыцці Бога Павел Вятрэнка. Вера яго набірае моц падчас пустэльнага знаходжання ў "зоне", дзе разам з жонкай ён пачынае маліцца:

*"Перад Маці Божай, ікона якой вісела ў зале, яна малілася ўголас.*

*Я станавіўся побач з ёй і таксама маліўся без слоў. Галя была ўдзячна мне за такую малітву: брала маю руку і сціскала яе ў гарачым парыве найвышэйшых пачуццяў"* [461].

Вобраз Галіны Вятрэнкі ў аповесці – гэта ўзор жаноцкасці, адданасці сям'і, мудрасці і цярпення. Пра сваю жонку герой зазначае:

*"Як мы зжыліся – як адно цэлае! Недарэмна кажуць: з любай ці любым рай і ў будане"* [391].

Здаецца, незайдросным з'яўляецца жыццё жонкі ваеннага. Аб'ездзіць, як кажуць, палову Саюза, жыць у "паходных умовах", заўсёды быць гатовай рушыцца на новае месца. Але нягледзячы на такія цяжкія жыццёвыя рэаліі, яна застаецца адданай спадарожніцай і надзейным сябрам свайму мужу.

*"А з табой мне ўсюды хораша, – прыціснулася Галя да майго пляча; у сорак гадоў, як у мядовы месяц"* [400].

Яна была не толькі добрай жонкай, але клапатлівай і любячай маці. У той жа час яе сэрца быццам адчувала бяду:

*"Галя была на сёмым небе: дома, у Беларусі, – і такая ўладжанасць, і службовая, і бытавая. Маглі б лічыць сябе шчаслівымі, каб не наша інтэрнацыянальная дапамога Афганістану. У любы час там можа апынуцца полк, у якім служыць Жэня.*

*Я не мог не бачыць, які страх перажывае мая жонка. Яна ажно схуднела, пастарэла. Калі ўспаміналі сына, а ўспаміналі часта, як і раней, з дня яго з'яўлення на свет, Галя прымхліва абыходзіла тэму афганскай вайны, быццам самі словы хавалі смяротную пагрозу: скажаш іх – і яны ўзарвуцца"* [410].

[10] Ідэя выратавання праз веру ў Бога гучыць у шэрагу твораў беларускіх аўтараў на чарнобыльскую тэму. Здаецца, што ў гэтай складанай сітуацыі чалавеку застаецца толькі адно – маліцца, нават спадзявацца на цуд, які можа вывесці з лабірынтаў трагічнага стану. Паэты і празаікі даволі часта звяртаюцца да малітоўна-хрысціянскіх матываў і інтанацый пры мастацкім адлюстраванні гэтай трагедыі, выкарыстоўваючы іх у творах розных жанраў: у аповесці ("Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько), у вершах ("Вячэрняя малітва"А. Пісьмянкова, "Малітва наступнасці" Р. Барадуліна, "Атамная малітва" В. Зуёнка), у паэмах ("Галгофа" К. Жука, "Аварыя сумлення" А. Зэкава, "Одзіум" Я. Сіпакова) і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да апошняга Галіна Вятрэнка спадзявалася, што застанецца напамін пра сына – унук, але дарэмна.

*"У свае сорак сем Галя стала белая-белая; пабялела яна не на пахаванні сына – пазней, як пачула, што Люда нарадзіла мёртвага сынка. У тры дні снег абсыпаў яе галаву"* [440].

Дагляд за магілай сына стаў штодзённым абавязковым клопатам для маці.

*"Галя ўсю цяпліцу заняла пад цюльпаны, каб насіць раннія кветкі на Жэневу магілу. Ды і агарод яна ўскопвала не пад цыбулю і гуркі, як мінулы год, – пад кветкі"* [441].

Супастаўляючы біяграфію пісьменніка, гісторыю яго сям'і з сюжэтам аповесці, можна заўважыць падабенства рыс характару гераіні аповесці "Зона павышанай радыяцыі" Галіны Вятрэнка і жонкі пісьменніка Марыі Філатаўны Шамякінай. Пра яе самааданасць сям'і, вернасць і любоў, перажыванне страты адзінага сына сведчаць дзённікавыя запісы пісьменніка[11].

Адзначанае вышэй дае магчымасць сцвярджаць.

Па-першае, І. Шамякін у аповесці "Зона павышанай радыяцыі" паказвае вайну ў Афганістане, аварыю на Чарнобыльскай АЭС праз бяду, перажыванні канкрэтнага чалавека Паўла Вятрэнкі. Абедзве гэтыя падзеі трагічна адбіліся на лёсе яго сям'і: гібель адзінага сына, жыццё ў "зоне радыяцыйнага забруджвання".

Па-другое, у творы маральныя праблемы разглядаюцца ў кантэксце праблем прафесійнай годнасці. Аўтар засяроджвае ўвагу чытача на кантрастных вобразах афіцэраў. Дабразычлівасці і любові да парадку супрацьстаяць уласная карысліць і фармалісцкія адносіны да ваеннай справы.

Па-трэцяе, Іван Шамякін сваім творам сцвярджае, што чалавек можа вытрымаць любыя іспыты. Так, Павел Вятрэнка на працягу жыцця сутыкаецца з неабходнасцю пераадольваць выпрабаванні лёсу. Цяжкасці, з якімі ён сустракаецца на жыццёвым шляху, не зламалі яго, а толькі актуалізавалі здольнасць спачуваць іншым людзям, разумець іх боль, прыйсці на дапамогу. Павел Вятрэнка паказаны як герой нашага часу, бо ён ніколі не губляў сваёй чалавечай годнасці, не заклямілў дрэнным учынкам афіцэрскі мундзір.

---

[11] У "Роздуме на апошнім перагоне" ўжо на першых старонках чытаем: *"У пятніцу і суботу была Маша* [у бальніцы, дзе ляжаў І. Шамякін у 1982 г. – *Л.Г.*]. *Праводзіла са мной гадзін па шэсць-сем. І гэта было ўжо амаль нармальнае жыццё: без нуды, без хандры, без сумных думак. Звычайная бытавая гаворка, больш – аб дзецях, менш – аб справах, зусім мала – аб літаратуры, пра яе ўсё сказана. Як гэта важна, каб побач быў блізкі чалавек. А хто бліжэй за жонку?! Мы хораша пражылі свае 42 гады. Мы любілі адно аднаго. І любім. Хоць характар любові зусім іншы, чым у маладосці. Якасна іншы. Адбылося поўнае парадненне. Роднасць душ, агульнасць жыцця, прывычак, клопатаў"* [Шамякін, І. Роздум на апошнім прагоне... – С. 8]. Шэраг старонак гэтага дзённіка 1980–1995 гадоў сведчыць пра найлепшыя якасці Марыі Філатаўны Шамякінай, добрай жонкі, маці, сястры [Там сама. – С. 8, 20–21, 82, 88, 91, 94, 104–105, 117, 164, 203, 232, 262–263, 265, 334–337, 339, 341, 355, 360–361, 363, 365, 367, 371–373, 378–379, 381, 399, 413, 422–426, 431, 495].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова